**#познайБеларусь**
**Традиции и праздники**

# ВЯЛІКДЗЕНЬ

Падрыхтавалі Грэчанік Яна, Січкар Лізавета
ДУА «Раёўскі вучэбна-педагагічны комплекс дзіцячы сад – базавая школа»

# ШТО ГЭТА ЗА СВЯТА ВЯЛІКДЗЕНЬ?




**Вялікдзень – гэта вялікае хрысціянскае свята Уваскрасення Ісуса Хрыста**

# ВЯЛІКДЗЕНЬ - ШТО ГЭТА МОЖА АЗНАЧАЦЬ?

Дзень стаў большым, а ноч карацейшая. Птушкі пачынаюць прылятаць з выраю, абуджаецца ўся прырода. Як казалі нашы бабулі: “На Вялікдзень, птушкі пачынаюць пець”, “На Вялікдзень зязюля пасля зімкі першы раз кукуе”. А для людзей пачынаюцца вялікія дні палявых работ. Раней людзі казалі: “Калі першы дзень Пасхі будзе цёплым і сонейка будзе харошае, то і лета будзе цёплым”



# А ЧАМУ ЯЙКІ ФАРБУЮЦЬ?

Пасля ўваскрасення Ісуса Хрыста адна жанчына, якую звалі Марыя Магдаліна, пешшу адправілася ў Рым да Імператара Тыберыя. Яна была вельмі бедная і не магла зрабіць імператару вельмі дарагі падарунак. Марыя прынесла яму звычайнае белае яйка і сказала: “Хрыстос уваскрос”. Імператар Тыберый здзівіўся: “Як можа хто-небудзь уваскрэснуць з мёртвых? Я ў гэта паверу толькі тады, калі гэта звычайнае белае яйка стане чырвоным”. Не паспеў ён гэта сказаць, як яйка ў руках пачырванела.



# ЯЙКА АЗНАЧАЕ ПАЧАТАК ЖЫЦЦЯ, А ХЛЕБ (ПАСХАЛЬНЫ КУЛІЧ) – ГЭТА САМО ЖЫЦЦЁ





Цяпер яйкі фарбуюць у розныя колеры, такія яйкі называюць маляванкамі, або пісанкамі. У чырвоную суботу, да заходу сонейка, людзі вельмі старанна гатуюць рытуальную ежу (яйкі, кулічы), потым ідуць у царкву асвяціць Пасху. А раніцай уся сям’я садзіцца снедаць.

# А ЦІ ЧУЛІ ВЫ ШТО-НЕБУДЗЬ ПРА ВАЛАЧОБНЫЯ ПЕСНІ І ХТО ТАКІЯ ВАЛАЧОБНІКІ, ШТО ЯНЫ РАБІЛІ, ЯКІЯ ПЕСНІ СПЯВАЛІ?

У ролі валачобнікаў выступалі маладыя хлопцы і дзяўчаты, якія хадзілі па дварах аднавяскоўцаў, спявалі валачобныя песні (“Гаспадынечка-журавіначка”, “А ў ляску, ляску”), у якіх жадалі людзям шчасця, здароў’я, добрага ўраджаю, сямейнага дабрабыту. Гаспадары сустракалі іх з радасцю, бо лічылі валачобнікаў прадвеснікамі добрага лёсу.






Фарбаваныя велікодныя яйкі і зараз дараць родным і знаёмым. Абмен такімі яйкамі-падарункамі паміж хлопцамі і дзяўчатамі азначаў іх прызнанне ва ўзаемным каханні. Важнае значэнне мела велікоднае яйка, атрыманае ў каго-небудзь першым: верылі, што яно не псуецца на працягу ўсяго года і мае цудадзейную сілу. Велікодныя яйкі клалі ў зерне, прызначанае для сяўбы.

На Вялікдзень дзеці ладзілі гульні з яйкамі. Каталі яйкі па жолабу, біліся ў яйкі, ці ў біткі гулялі, таксама наладжвалі ігрышчы, гушкаліся на арэлях, вадзілі карагоды (каб ўсё расло).



З велікоднага тыдня пачынаюцца закліканне вясны, ваджэнне карагодаў і летнія гулянні.



# ДЗЯКУЙ ЗА ЎВАГУ!

